*П. Л. Дзям’ян*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск

*P. Dziatyan*
National Institute for Higher Education, Minsk

**УДК 94(476)“1654/1667”**

# ДЫПЛАМАТЫЧНЫЯ КАНТАКТЫ Б. РАДЗІВІЛА ЯК СРОДАК АБАРОНЫ СВАІХ УЛАДАННЯЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ПАДЧАС ВАЙНЫ 1654–1667 ГГ.

# B. RADZIWILL'S DIPLOMATIC CONTACTS AS A MEANS OF PROTECTING HIS POSSESSIONS ON THE TERRITORY OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE PERIOD OF THE WAR OF 1654–1667

*У артыкуле на падставе архіўных і апублікаваных крыніц даследаваны дыпламатычныя кантакты князя Б. Радзівіла з Маскоўскай дзяржавай і Гетманшчынай у сярэдзіне XVII ст. Прааналізаваныя аўтарам крыніцы дазволілі разгледзець асноўныя этапы дадзеных кантактаў, апісаць і параўнаць іх вынікі як важнага сродку абароны ўладанняў Б. Радзівіла на тэрыторыі ВКЛ у перыяд вайны 1654–1667 гг.*
*Ключавыя словы: Радзівілы; Маскоўская дзяржава; вайна 1654–1667 гг.*

*Based on archival and published sources, the article examines the diplomatic contacts of Prince B. Radziwill with the Moscow State and the Hetmanate in the middle of the 17th century. The sources analyzed by the author made it possible to consider the main stages of these contacts, describe and compare their results as an important means of protecting the possessions of B. Radziwill on the territory of the Grand Duchy of Lithuania during the war of 1654-1667.*
*Key words: Radziwills; Moscow state; war of 1654–1667.*

Вайна паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай пачалася ў маі 1654 г. У выніку першага этапу вайны 1654–1655 гг., амаль усё Вялікае Княства Літоўскае апынулася пад уладай цара Аляксея Міхайлавіча. Выключэннем былі толькі частка Наваградскага і Берасцейскага ваяводстваў. Тэрыторыя Берасцейскага ваяводства засталася па кантролем войска ВКЛ, якое захавала вернасць каралю Рэчы Паспалітай, а Наваградчына, дзе былі вялікія ўладанні князя Багуслава Радзівіла, аказалася пад пратэктаратам шведскага караля.

Падобная сітуацыя склалася ў выніку Кейданскай уніі, якую падпісала частка эліты ВКЛ у жніўні 1655 г. Па яе умовах ВКЛ разрывала ўсе сувязі з Польшчай і станавілася часткай Шведскага каралеўства. Узамен за гэта шведскі кароль абяцаў вызваліць усе захопленыя ў 1654–1655 гг. Масквой тэрыторыі ВКЛ. Галоўнымі ініцыятарамі гэтай палітычнай акцыі былі прадстаўнікі біржанскай лініі роду Радзівілаў – князі Януш і Багуслаў. Яны перайшлі пад пратэктарат Швецыі разам са сваімі ўладаннямі. Аснову

гэтых маёнткаў складалі Слуцкае і Капыльскае княствы, а таксама больш дробныя двары. Пачынаючы з 1655 г. уладанні Б. Радзівіла на Наваградчыне былі з розных бакоў акружаныя тэрыторыяй ВКЛ, якая была падкантрольная Маскве і запарожскім казакам. Войска ВКЛ таксама разглядала ўладанні князя як непрыяцельскія, паколькі ён прыняў шведскую пратэкцыю.

У такой сітуацыі Б. Радзівіл не мог спадзявацца выключна на ваенны шлях абароны сваіх уладанняў. У сувязі з гэтым князь актыўна прыбягаў да выкарыстання дыпламатычных сродкаў для абароны сваіх маёнткаў на тэрыторыі Наваградскага ваяводства падчас вайны 1654–1667 гг.

У гістарыяграфіі пытанне дыпламатычных кантактаў прадстаўнікоў роду Радзівілаў з Гетманшчынай і Маскоўскай дзяржавай у сярэдзіне XVII ст. разглядалася ў работах польскіх, украінскіх і расійскіх даследчыкаў. Дыпламатычныя кантакты Б. Радзівіла з гетманам Багданам Хмяльніцкім даследаваў польска-канадскі гісторык Эндру Пернал [1]. Аўтар падрабязна апісаў ход і вынікі двух дыпламатычных місій прадстаўніка Б. Радзівіла – Самуэля Стэфановіча да запарожскага гетмана ў 1656 г. Пра дыпламатычныя спосабы абароны маёнткаў Б. Радзівіла на Наваградчыне, у перыяд вайны 1654–1667 гг., згадваюць у сваіх артыкулах польскія гісторыкі Конрад Бабятынскі і Кшыштаф Касажэцкі [2; 3]. У грунтоўнай рабоце ўкраінскага даследчыка Міхаіла Грушэўскага «Гісторыя Украіны-Русі» таксама закранаецца тэма дыпламатычных сувязей Б. Радзівіла і Б. Хмяльніцкага [4]. Аўтар выкарыстаў шэраг крыніц маскоўскага паходжання, што дазволіла яму паказаць рэакцыю маскоўскіх ваяводаў на кантакты гетмана Б. Хмяльніцкага з прадстаўнікамі Б. Радзівіла ў 1656 г. Акрамя выключна палітычнага боку дадзеных сустрэч, М. Грушэўскі закрануў гандлёва-эканамічныя стасункі, якія існавалі паміж слуцкімі ўладаннямі Б. Радзівіла і Гетманшчынай у акрэслены перыяд. У расійскай гістарыяграфіі пытанне дыпламатычных кантактаў Б. Радзівіла з царскім урадам даследаваў Барыс Мікалаевіч Флора [5]. Ён разгледзеў дадзеную праблематыку ў межах сваёй манаграфіі, прасвечанай дыпламатычным кантактам Маскоўскай дзяржавы ў 1655–1660 гг. з еўрапейскімі краінамі. Таксама Б. М. Флора прысвяціў асобны артыкул дыпламатычным стасункам Б. Радзівіла з прадстаўнікамі Маскоўскай дзяржавы ў перыяд вайны 1654–1667 гг. [6].

Асноўную групу крыніц па тэме даследавання складаюць матэрыялы эпісталярнага і актавага характару. Пэўныя кантакты з сярэдзіны XVII ст. Б. Радзівіл падтрымліваў з прадстаўнікамі Маскоўскай дзяржавы. Захаваўся шэраг лістоў князя да ваяводы Афанасія Ордзін-Нашчокіна і ваяводы Івана Хаванскага за 1660 г. [7; 8]. Шляхам пастаянных кантактаў Б. Радзівіл спрабаваў пераканаць маскоўскіх ваявод у сваёй прыязнасці і такім чынам абараніць свае ўладанні ад магчымых нападаў і знішчэння маскоўскім войскам. Акрамя гэтага захаваліся лісты Б. Радзівіла да прадстаўнікоў сваёй адміністрацыі ў Слуцку. Для нас у першую чаргу інтарэс уяўляюць лісты да С. Стэфановіча і іншых асоб. Гэтыя дакументы з’яўляюцца важнымі для

вывучэння дыпламатычных кантактаў з Гетманшчынай у сярэдзіне XVII ст. Актавыя крыніцы прадстаўлены разнастайнымі ўніверсаламі гетмана Б. Хмяльніцкага і палкоўнікаў Войска Запарожскага. Гэтыя дакументы даваліся з мэтай аховы маёнткаў Б. Радзівіла ад нападаў запарожскіх казакоў у перыяд вайны 1654–1667 гг. [9].

Як бачна, пытанне дыпламатычных кантактаў Б. Радзівіла з Гетманшчынай і Маскоўскай дзяржавай у акрэслены перыяд ужо часткова даследавана ў работах папярэдніх даследчыкаў. Тым не менш, гісторыкі не разглядалі дыпламатычныя захады Б. Радзівіла як адзін з спосабаў забяспечыць абарону для сваіх маёнткаў, што разам з наяўнасцю шэрагу не выкарыстаных раней крыніц дазваляе больш грунтоўна вывучыць дадзенае пытанне.

Мэта дадзенага артыкула палягае ў наступным: разгледзець дыпламатычныя кантакты Б. Радзівіла з Гетманшчынай і Маскоўскай дзяржавай, у перыяд вайны 1654–1667 гг., у кантэксце захадаў па абароне сваіх уладанняў на тэрыторыі Наваградскага ваяводства.

Цягам 1654–1655 гг. запарожскія казакі змаглі авалодаць паўднёва-ўсходнімі паветамі ВКЛ. Прысутнасць запарожцаў на землях ВКЛ стала прычынай актывізацыі працэса паказачання мясцовых жыхароў і стварэння новых казацкіх атрадаў. Актыўнасць гэтых атрадаў распаўсюджвалася ў тым ліку на тэрыторыю Наваградчыны, дзе пэўны час дзейнічаў казацкі сотнік Дзяніс Мурашка.

З’яўленне казакоў паблізу ад уладанняў Б. Радзівіла стварала шэраг відавочных праблем, паколькі яны нападалі на шляхецкія маёнткі, забівалі шляхту, а мясцовыя сяляне далучаліся да казацкіх ватаг. Вырашыць гэта пытанне без прамых кантактаў з гетманам Б. Хмяльніцкім не прадстаўлялася магчымым. Для запарожскага гетмана кантакты з Б. Радзівілам таксама былі цікавыя, паколькі праз прадстаўнікоў князя можна было падтрымліваць сувязі са шведскім каралём. Асабліва важнай для запарожскага гетмана дадзеная магчымасць стала ў 1656–1657 гг., калі Б. Хмяльніцкі імкнуўся разам са шведамі арганізаваць антыпольскі саюз, а функцыю дыпламатычных пасрэднікаў у гэтай сітуацыі выконвалі прадстаўнікі Б. Радзівіла.

Першае пасольства Б. Радзівіла да запарожскага гетмана адбылося вясной 1656 г., яго ўзначальваў слуцкі войт Самуэль Стэфановіч. У пачатку красавіка ён атрымаў ад Б. Радзівіла інструкцыі для будучага пасольства [1, p. 519–520]. Пасля гэтага, 4 красавіка 1656 г., С. Стэфановіч выехаў у Кіеў. Туды ён прыбыў 11 красавіка і затрымаўся ў Кіеве на адзін тыдзень, пасля чаго выправіўся ў Чыгірын, дзе знаходзіўся сам гетман. У гетманскую сталіцу С. Стэфановіч прыехаў толькі 24 красавіка [1, p. 520]. Падчас асабістага прыёму прадстаўнік Б. Радзівіла перадаў лісты князя Б. Хмяльніцкаму і правёў размову, бакі запэўнілі адзін аднаго ў шчырасці і гатоўнасці да супрацоўніцтва. Акрамя палітычных пытанняў, якія былі абмеркаваны, Б. Хмяльніцкі пагадзіўся выдаць ахоўныя ўніверсалы на ўладанні Б. Радзівіла на Наваградчыне. Першы ўніверсал быў датаваны 28 красавіка 1656 г.

[1, p. 521]. У ім гетман забараняў сваім казакам чыніць свавольства ва ўладаннях Б. Радзівіла. Крыху пазней, 17 траўня, быў выдадзены яшчэ адзін універсал, які пашыраў змест папярэдняга і ўтрымліваў дазвол на свабодны гандаль для слуцкіх купцоў у Гетманшчыне [1, p. 521; 9, c. 187]. Пасля завяршэння сваёй місіі С. Стэфановіч у канцы мая 1656 г. вярнуўся ў Слуцк.

У другі раз слуцкі войт быў накіраваны да запарожскага гетмана напрыканцы ліпеня 1656 г. Вядомы ліст Б. Радзівіла да С. Стэфановіча ад 22 ліпеня з падзякай за службу і абяцаннем узнагародзіць за паслугі [7, с.103]. Праз два дні, 24 ліпеня, князь выслаў новую інструкцыю для пасольства. Згодна інструкцыі, С. Стэфановіч павінен быў запэўніць гетмана ў ранейшай прыязнасці і прасіць пра новыя ўніверсалы на абарону ўладанняў Б. Радзівіла [7, с.104–106]. Пры гэтым князь прасіў не проста забараніць казакам рабаваць свае ўладанні, размова ішла пра абарону маёнткаў на Наваградчыне ў больш шырокім сэнсе. Б. Радзівіл прасіў абараніць свае ўладанні ад «польскіх людзей», пад гэтай фразай, відаць, разумелася войска Рэчы Паспалітай вернае каралю Яну Казіміру і маскавітаў. Такім чынам можна гаварыць пра пэўную форму пратэкцыі з боку гетмана Б. Хмяльніцкага над уладаннямі Б. Радзівіла. Акрамя гэтага, запарожскаму гетману былі перададзены лісты каменданта Слуцка Яна Гроса, у якіх былі скаргі на свавольства казакоў на Случчыне [1, p. 523–524].

Другое пасольства С. Стэфановіча ў Чыгірын завяршылася таксама паспяхова. Гетман Б. Хмяльніцкі ў сярэдзіне жніўня 1656 г. выдаў новы ўніверсал на імя палкоўніка Івана Нячая, якім забараняў здзяйсняць напады на Слуцк і ваколіцы [9, с. 205]. Таксама гетман даў адказ на скаргі Я. Гроса. Ён запэўніў каменданта Слуцка, што не загадваў казакам рабаваць маёнткі Б. Радзівіла, а сотнік Мурашка, якога згадвае ў лісце Я. Грос, увогуле не вядомы Б. Хмяльніцкаму [7, с. 106]. Пры гэтым І. Нячаю быў дадзены загад караць розных свавольнікаў, якія дзейнічаюць ад імя Войска Запарожскага. Праз пэўны час, у канцы лістапада 1656 г., з’явіўся яшчэ адзін гетманскі ўніверсал на абарону Слуцка. Гэтым універсалам Б. Хмяльніцкі пацвердзіў сваю пратэкцыю над Слуцкім княствам і чарговы раз нагадаў казакам, што любыя напады на гэтыя ўладанні катэгарычна забаронены [9, с. 215]. Акрамя, выключна, клопатаў пра недатыкальнасць сваіх маёнткаў з боку казакоў, Б. Радзівіл дбаў пра забеспячэнне Слуцка належнымі прадуктамі харчавання, якія можна было набыць на ўкраінскіх землях. Гандаль меў значныя маштабы, паколькі прыцягнуў увагу маскоўскіх ваяводаў у Кіеве. Яны запатрабавалі ад Б. Хмяльніцкага спыніць продаж розных тавараў у Слуцк, што і было фармальна выканана [4, с.1269–1272]. Тым не менш, праз пэўны час маскоўскія ваяводы зноў адзначалі вываз тавараў з Гетманшчыны ў розныя гарады ВКЛ, але Б. Хмяльніцкі на іх запыты па гэтым пытанні ніяк не рэагаваў.

Акрамя дыпламатычных кантактаў з Гетманшчынай, Б. Радзівіл спрабаваў пэўным чынам падтрымліваць сувязь з прадстаўнікамі Маскоўскай

дзяржавы. Першыя крокі на гэтым накірунку былі зробленыя восенню 1655 г. У выніку ваеннай кампаніі лета-восені 1655 г. уладанні Б. Радзівіла ў Наваградскім ваяводстве былі разбураны войскамі ваяводы Аляксея Трубяцкога. Гэта падштурхнула Б. Радзівіла звярнуцца за пасрэдніцтвам да шведскага намесніка ў Інфлянтах Магнуса де Лагардзі. Літоўскі магнат прасіў М. де Лагардзі пра абарону сваіх маёнткаў ад царскага войска, паколькі падчас перамоў у верасні 1655 г. з паслом Афанасіям Несцеравым шведскі намеснік узняў гэтае пытанне. Ён заявіў, што Слуцк і Нясвіж знаходзяцца пад шведскай уладай як уладанні Б. Радзівіла. Акрамя гэтага М. де Лагардзі заявіў, што частка шляхты з гэтых уладанняў ужо прысягнула шведскаму каралю. Маскоўскі бок на гэтыя просьбы адрэагаваў адмоўна. Той жа А. Несцераў падчас перамоў заявіў, што шведскаму каралю патрэбна: «Радивила и ту шляхту достоить держать в своих городех» [цыт. па 6, s. 27–28].

У першай палове 1656 г. усё больш відавочнай станавілася перспектыва будучай вайны паміж Швецыяй і Маскоўская дзяржавай. Гэта паспрыяла таму, што Б. Радзівіл пачаў шукаць новых пасрэднікаў для далейшых кантактаў з Масквой. На гэтым этапе ён змог знайсці падтрымку ў Брандэнбургу. Так, у маі 1656 г. прускі канцлер падчас перамоў з царскім дыпламатам Даніілам Мышэцкім прасіў, у выпадку магчымай вайны з Швецыяй, не кранаць маёнткі Б. Радзівіла. Гэтая просьба выклікала негатыўную рэакцыю Д. Мышэцкага паколькі Б. Радзівіл быў пад пратэкцыяй шведскага караля, а значыць, разглядаўся як магчымы праціўнік [6, s. 28–29]. Пачынаючы з канца 1656 г. і да восені 1657 г. Б. Радзівіл спрабаваў наладзіць пэўныя кантакты з прадстаўнікамі Маскоўская дзяржавы за пасрэдніцтвам удавы свайго стрыечнага брата Я. Радзівіла – Марыі Радзівіл, а таксама канцлера курляндскага герцага. На гэтым этапе Б. Радзівілу не ўдалося дасягнуць паразумення з Масквой. Тым не менш, князь працягваў шукаць новыя спосабы для дасягнення сваіх мэтаў [6, s. 30–33].

Да змены ва ўзаемных кантактах паміж Б. Радзівілам і царскім урадам дайшло ў 1658 г., калі на сойме Рэчы Паспалітай павінна была разглядацца кандыдатура цара на польскі трон. У гэтай сітуацыі Аляксею Міхайлавічу патрэбна было шукаць прыхільнікаў для ўмацавання сваіх пазіцый падчас элекцыі. Менавіта ў такім кантэксце на Б. Радзівіла звярнулі ўвагу на царскім двары. Каб прыцягнуць літоўскага магната на свой бок, маскоўскаму паслу А. Несцераву, які павінен быў ехаць да брандэнбургскага князя, былі дадзеныя царскія граматы з пацверджаным маёмасных правоў для Б. Радзівіла. Пры гэтым, былі сфармуляваныя дзве ўмовы, выканаўшы якія, Б. Радзівіл мог атрымаць царскія граматы: па-першае, ён павінен быў падтрымаць царскую кандыдатуру на сойме, а па-другое, – прыняць маскоўскае падданства [6, s. 34–36]. Згадзіцца на гэтыя ўмовы Б. Радзівіл на той момант не мог, паколькі яго становішча ўжо істотна змянілася. У кастрычніку 1657 г. ён быў прызначаны намеснікам брандэнбургскага князя ў каралеўскай Прусіі, а ў лістападзе таго ж году атрымаў поўную амністыю ў Рэчы Паспалітай.

Пасля гэтага пераход ў царскае падданства для Б. Радзівіла страціў усякі сэнс.

Тым не менш, кантакты з царскімі ваяводамі па-ранейшаму былі актуальнымі для Б. Радзівіла. Восенню 1659 г. у Коўне былі затрыманыя два караблі з соллю, якія належалі князю канюшаму. Гэта было адказам на дзеянні атрадаў з Слуцка, якія дазвалялі сабе здзяйсняць напады на казакоў і маскоўскія атрады ў гэты час. Уся гэтая сітуацыя адбывалася на фоне новага наступу ваяводы І. Хаванскага ў заходнія паветы ВКЛ восенню 1659 г., што стварала небяспеку для уладанняў Б. Радзівіла на Наваградчыне [6, s. 37].

Для таго каб залагодзіць сітуацыю Б. Радзівіл выслаў у студзені 1660 г. да ваяводы А. Ордзін-Нашчокіна свайго прадстаўніка Пятра Хофмана. У сваім лісце ад 2 студзеня 1660 г. Б. Радзівіл паведамляў ваяводзе апошнія еўрапейскія навіны і прасіў яго: «каб веры даў, таму, што ад майго імя (пасланнік) перадасць» [5, с. 554–555; 8, s. 104]. Другі ліст, дата якога не вядома, Б. Радзівіл адправіў да А. Ордзін-Нашчокіна ўжо пасля вяртання П. Хофмана. У гэтым лісце князь запэўнівае маскоўскага ваяводу ў тым, што яго войскі са Слуцка не бралі ўдзел у нападзе на Магілёў. Ён сцвярджае, што даў загад свайму гарнізону ў Слуцку, каб яны: «спакойна і па-прыяцельску жылі з людзьмі царскай вялікасці», а адказным за напад на Магілёў, паводле Б. Радзівіла, быў аддзела палкоўніка Яна Сасноўскага з войска ВКЛ. Акрамя гэтага князь дзякаваў А. Ордзін-Нашчокіну за абяцанне выдаць граматы на ахову яго маёнткаў ад нападаў царскага войска. Ён прасіў аддаць гэтыя дакументы пасланцу, каторы меў пры сабе рэестр, на якія канкрэтна маёнткі патрэбныя абаронныя граматы. Было таксама ўзнята пытанне пра затрыманую соль у Коўне. Б. Радзівіл сцвярджаў, што тры віціны з соллю былі затрыманы незаконна, паколькі ўсе пошліны ў царскую казну былі заплачаны[1]. Акрамя гэтага князь прыгадаў пра свайго слугу, які суправаджаў віціны і быў затрыманы ў Коўне. Ён прасіў аддаць загад вызваліць яго з вязніцы. Таксама было ўзнята яшчэ адно гандлёвае пытанне. Б. Радзівіл прасіў ваяводу даць «пашпарт або ліст» на вольны вываз са Слуцкага княства ў Каралявец лясных тавараў. Напрыканцы князь запэўніў А. Ордзін-Нашчокіна ў тым, што і далей будзе паведамляць ваяводзе ўсе важныя ваенныя і палітычныя навіны, пра якія мае інфармацыю сам [8, s. 105–106; 107].

Вясной 1660 г., калі ў самым разгары была аблога Ляхавічаў, князь Б. Радзівіл напісаў яшчэ адзін ліст, датаваны 4 мая, да маскоўскага ваяводы Івана Хаванскага. У гэтым лісце Б. Радзівіл звяртаецца да І. Хаванскага з просьбай захаваць яго маёнткі ад разбурэнняў з боку маскоўскага войска. Ён матываваў гэта тым, што цар і брандэнбургскі князь заключылі вечны мір, а ён з'яўляецца прускім намеснікам і слугой князя. У сувязі з чым, нібыта, цар гарантаваў бяспеку для яго ўладанняў ад знішчэння сваім вой-

[1] Б. Н. Флора сцвярджае, што віцін было дзве, але гэта разыходзіцца з інфармацый, якую падае ў сваім лісце Б. Радзівіл.

скам. Акрамя гэтага Б. Радзівіл прасіў ваяводу ў выпадку калі да яго будуць звяртацца слугі князя, каб той «праявіў сваё ласку» да іх [3, с. 306; 8, s.178]. Якія вынікі мог мець дадзены ліст і якую рэакцыю ён выклікаў у ваяводы – сказаць складана. Пасля паразы І. Хаванскага пад Палонкай небяспека для ўладанняў Б. Радзівіла істотна зменшылася, як і неабходнасць падтрымліваць пастаянныя кантактавы з прадстаўнікамі Масквы, хаця пэўныя сувязі з асобнымі ваяводамі князь захоўваў і ў наступныя гады [7, с.118–119,120].

Дыпламатычныя кантакты Б. Радзівіла з Маскоўскай дзяржавай і Гетманшчынай у перыяд вайны 1654–1667 гг. былі важным сродкам для абароны ўладанняў князя ў Наваградскім ваяводстве. Найбольшых поспехаў удалося дасягнуць у кантактах з Б. Хмяльніцкім. Запарожскі гетман у 1656 г. задаволіў усе просьбы Б. Радзівіла, якія тычыліся абароны маёнткаў апошняга ад нападаў казакоў, больш таго, па выніках другога пасольства С. Стэфановіча Б. Хмяльніцкі фактычна ўзяў пад пратэктарат уладанні князя на Наваградчыне і паабяцаў абараняць іх ад любых ворагаў. Акрамя гэтага, паміж Слуцкам і ўкраінскімі землямі актыўна развіваліся ўзаемавыгадныя гандлёва-эканамічныя адносіны. Паспяховасць дыпламатычных кантактаў Б. Радзівіла з Б. Хмяльніцкім была вынікам узаемнай зацікаўленасці і выгады для бакоў.

Інакш выглядаюць кантакты Б. Радзівіла з Маскоўскай дзяржавай. Пачынаючы з 1655 г. князь канюшы спрабаваў дамагчыся прызнання сваіх правоў на маёнткі ў ВКЛ і абараніць іх ад магчымага знішчэння. Для гэтага князь хацеў атрымаць царскія граматы, але маскоўскі бок пагаджаўся задаволіць гэтыя просьбы толькі пасля прыняцця царскага падданства Б. Радзівілам, што было невыгодна для апошняга. Таму дасягнуць істотнага прагрэсу ва ўзаемных кантактах не ўдалося. Прычына гэтага, на нашу думку, заключалася ў адсутнасці сапраўднай зацікаўленасці бакоў. Для Маскоўскай дзяржавы пазіцыя Б. Радзівіл да пэўнага моманту не была цікавай, таму ісці насустрач просьбам магната ніхто не збіраўся. Тое самае можна сказаць пра паводзіны Б. Радзівіла, якія, па словах польскага гісторыка К. Бабятынскага, былі часткай «тыповай для тагачасных магнатаў і шляхты гульні, асноўнай мэтай якой было ўратаванне ад знішчэння маскоўскімі войскамі ўласных уладанняў» [2, с.14]. Нягледзячы на адсутнасць значных поспехаў Б. Радзівіл падтрымліваў пастаянныя кантакты з маскоўскімі ваяводамі да лета 1660 г. Сітуацыя змянілася пасля бітвы пад Палонкай, дзе былі разбітыя войскі І. Хаванскага, а маскоўская пагроза для значнай часткі ВКЛ была знята. Пасля гэтага кантакты з Масквой для Б. Радзівіла страцілі сваю ранейшую актуальнасць.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Pernal, A.* Diplomatic Contacts between Bogusław Radziwiłł and Bohdan Khmel'nyts'kyi in 1656: Two Unpublished Documents / A. Pernal // Mappa Mundi: Збірник наукових праць на пошану Я. Дашкевича з нагоди його 70-річчя. – Львів; К.; Нью-Йорк, 1996. – P. 509–532.

2. *Бабятынскі, К.* Прыватныя фартэцыі ў ВКЛ пад час вайны з Масквою (1654–1667) / К. Бабятынскі // Беларускі гістарычны агляд. – 2012. – Т. 19, Сшытак 1–2. – С. 3–30.

3. *Касажэцкі, К.* Слуцк перад абліччам маскоўскай і казацкай пагрозы падчас вайны з Масквой у 1654–1667 гг. / К. Касажэцкі // Arche Пачатак: Вайсковая гісторыя Вялікага Княства Літоўскага. – 2012. – № 6. – С. 285–314.

4. *Грушевський, М. С.* Історія України – Руси: в 11 томах, 12 книгах / М. С. Грушевський, редкол.: П. С. Сохань (голова) [та ін.]. – Київ: Наукова думка, 1991–1998. – Т. 9. – Кн. 1. – Київ, 1996. – 880 с.

5. *Флоря, Б. Н.* Русское государство и его западные соседи (1655–1661 гг.) / Б. Н. Флоря. – М.: Индрик, 2010. – 656 с.

6. *Floria, B. N.* Bogusław Radziwiłł a Rosja / B.N. Floria // Kwartalnik Historyczny. – 2009. – T. 116, Z. 4. – S. 27–41.

7. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при Управлении Виленского учебного округа. Т. 7 [документы 1433–1791 гг.] / собранный в Несвиже и изданный П. Гильтебрандтом и А. Миротворцевым. – Печатня А. Г. Сыркина, 1870. – 375 с.

8. Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD). – Archiwum Warszawskie Radziwiłłów. – Dz. IV. Syg. 745. – Korespondencja Bogusława Radziwiłła. 1659–1660. – 184 s.

9. Універсали Богдана Хмельницького 1648–1657 / упорядн.: І. Крип'якевич, І. Бутич; ред. кол.: В. Смолій (голова); НАН України. Інститут історії України, Інститут української археографії та джерелознавства ім. М. С. Грушевського. – Кїев: Альтернативи, 1998. – 416 с.

**(Дата падачы: 20.02.2023 г.)**

*К. Д. Довматович*
Белорусский государственный университет, Минск

*K. D. Dovmatovich*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(474/476 ВКЛ):930(4–11)«18/19»+328(474/476 ВКЛ)**

# СЕЙМ ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО В ИСТОРИОГРАФИИ ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ КОНЦА XIX – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЫ XX В.

# THE SEJM OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN THE HISTORIOGRAPHY OF EASTERN EUROPE IN THE END OF THE 19TH – THE FIRST HALF OF THE 20TH CENTURIES

*Автором были определены сформированные на рубеже XIX–XX вв. московское, киевское и петербуржское направления исторической мысли в изучении сейма Великого Княжества Литовского (ВКЛ). Сделан вывод о том, что единое научное пространство и взаимоотношения учитель – ученик в университетской среде позволило на протяжении 1920–1930-х гг. обеспечить функционирование классического нарратива, посвященного сейму ВКЛ.*